Пяць спосабаў, як добра перажыць св. Імшу

Аўтар: А. Марэк Ройшык ОР
06.09.2015 01:00

Мы часта вінавацім сябе ў тым, што не зусім уважліва ўдзельнічалі ў святой Імшы. Мы гаворым пра гэта на споведзі і, паабяцаўшы выправіцца, у наступны раз прыкладаем усе намаганні, каб засяродзіцца. І што? І нічога. Нашы думкі, на жаль, нас не слухаюцца. Вось некалькі падказак для таго, каб “палепшыць” наш удзел у Эўхарыстыі. 1. Прачытай дома

літургічныя чытанні.

Напэўна, табе даводзілася трапляць у сітуацыю, калі, адказваючы на вокліч “Гэта Слова Пана”, ты раптам усведамляў, што паняцця не маеш, пра што было Евангелле. Гэтага можна пазбегнуць. Дастаткова дома прачытаць сённяшнія чытанні. Яны даступны ў сетцы і ў выглядзе бясплатных рассылак на электронную пошту. †

2. Прыйдзі за дзесяць хвілін да пачатку Імшы.

Збіраючыся на важную падзею, канцэрт ці спектакль, мы стараемся прыйсці трохі загадзя. Па-першае, каб не прапусціць нічога важнага, а па-другое, каб не перашкаджаць астатнім, прыходзячы ў апошні момант. Чаму Імша павінна быць выключэннем? Акрамя таго, хвіліна цішыні і засяроджання можа стаць вырашальнай для перажывання ўсёй літургіі.

3. Памаліся аб тым, што важна для цябе.

У структуры Імшы ёсць моманты цішыні, якія можна выкарыстоўваць для асабістых малітоўных зваротаў. Яны ёсць у акце пакаяння, пасля прызыву “памолімся”, у моманце прынашэння дароў, перамянення, а таксама пасля Камуніі. Нашыя просьбы могуць быць заўсёды аднолькавымі або рознымі, але яны дазваляюць перажываць літургію “тут і цяпер”.

4. Ужывай голас.

Гэта вельмі дапамагае. На Імшы галоўнае – не засяроджванне само па сабе, а свядомы ўдзел. Усвядомленае прагаворванне дапамагае думкам ахвотней ісці за тэкстам. Калі нешта адбываецца толькі ў нашай галаве і не знаходзіць выражэння ў словах ці жэстах, цяжка нават казаць пра ўдзел. Ну і, вядома, “хто спявае, той моліцца двойчы”.

5. Ідзі да Камуніі.

Калі мы прыходзім на ўрачысты прыём, то звычайна толькі ў адным выпадку нічога не ядзім – калі мы хворыя. Рэдка хто ўспамінае такія прыёмы як уданыя. Можа, гэта добрая аналогія? Тым больш, што ад гэтай хваробы існуюць выдатныя лекі.

Але не спавядайся падчас Імшы. І ўжо дакладна не плануй споведзь на час літургіі загадзя. Імша – не час для споведзі. Пакуль паспавядаешся, пройдзе большая частка Імшы. Калі на сумленні ёсць грэх, які не дазваляе прыступіць да Камуніі, спавядайся загадзя, каб нядзельная Імша стала для цябе святам, а не часам пакаяння. Калі ты стала прыступаеш да Камуніі і рэгулярна спавядаешся, то тым больш ты не павінен спалучаць два гэтыя сакраманты.

 Літургія – гэта рэальнасць, у якую мы можам уключыць усю нашу чалавечую прыроду. Часта мы пераацэньваем інтэлектуальны аспект, забываючыся пра тое, што ў нас ёсць яшчэ і цела. Але парадаксальна: паглыбленне нашай свядомасці можа паспрыяць таму, што мы больш актыўна пачнём удзельнічаць у літургіі. Таму звычайна важна разумець, у чым жа мы ўдзельнічаем і які гэта мае сэнс.